ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 146 | АЎТОРАК, 27 чэрвеня 1933 г. | № 146

ПРА ПАРАДАК ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЗЬЛЁТУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

Учора арганізацыйная камісія па скліканьні другога раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў вызначыла расклад месц, прадстаўляемых сельсаветам на зьлёт.

Калгасам Замастоцкага сельсавету вызначана 60 месц, Сялюцкага—50, Шумнянскага—35, В.-Лётчанскага—35, Віцебскага—25, Ялагінскага—35, Бараўлянскага—30, Бабініцкага—25, Старасельскага—25, Машканскага—40, Міхалёўскага—35 і Мікалаёўскага—25.

Калгасы Рудніцкага і Рудакоўскага сельсаветаў, за выключэньнем калгасу «Дырыжабль», Даўжанскага, за выключэньнем калгасу „Шлях Ільліча", і калгас імя Леніна, Бараўлянскага сельсавету, умоўна пазбаўлены права на пасылку дэлегатаў на раённы зьлёт. Тут арганізацыя ўлічыла ганебныя паказальнікі сяўбы па гэтых сельсаветах і надзвычайна нездавальняючае становішча ўздыму папару. Асобна папярэджаны калгасы Шумнянскага і Сялюцкага сельсаветаў, што калі ня ліквідуюць свайго адставаньня ва ўздыме папару, яны таксама будуць пазбаўлены месца на зьлёт.

Для калгасаў „Шлях Ільліча" і „Дырыжабль" вызначана па 4 дэлегацкіх месц. 40 гасьцявых білетаў намечаны для лепшых працоўных аднаасобнікаў тых вёсак, якія пасьпяхова выканалі плян сяўбы і ўзьнялі сваечасова папар.

30 мандатаў намечаны для лепшых ударнікаў каапэрацыйных гаспадарак і 150 гасьцявых білетаў для прадстаўнікоў шэфствуючых прадпрыемстваў, в якіх арганізацыя 10 месц прадставіла лесакамбінату БВА, ямі лепш за ўсіх арганізаваў шэфскую работу.

Выбары дэлегатаў на другі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў павінны праводзіцца на агульных сходах калгасаў пасьля абгаварэньня вынікаў сяўбы, узьняцьця папару, праполкі і пляну ўборачнай кампаніі і хлебаздачы.

Арганізацыя абавязала гаршэфсавет арганізаваць да 3 ліпеня даклады падшэфных калгасаў на сходах рабочых шэфствуючых прадпрыемстваў і абавязкова забясьпечыць удзел шэфаў у вытворчых нарадах калгасаў.

Права на ўдзел у зьлёце перадавых даецца толькі лепшым.

Гэктарамі ўзьнятага папару, сканчэньнем першай праполкі заваёўвайце мандаты на зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў.

ЗА БАЯВУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЗЬЛЁТАЎ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

10 ліпеня ў Менску зьбярэцца другі Ўсебеларускі зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў. У падрыхтоўцы да яго па ўсёй Беларусі праводзяцца раённыя зьлёты калгасьнікаў-ударнікаў. Гарком КП(б)Б пастанавіў правесьці ў Віцебску другі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў 5 ліпеня. Такім чынам да раённага зьлёту перадавых майстраў сацыялістычнага земляробства застаецца 9 дзён.

Раённы зьлёт павінен быць зьлётам баявой зарадкі калгасьнікаў і калгасьніц на баявое бальшавіцкае выкананьне партыйна-ўрадавых заданьняў па праполцы, уборцы і хлебазагатоўчай кампаніі. І гэты зьлёт апраўдае сваё прызначэньне, зьвяцца зьлётам баявой зарадкі толькі тады, калі да яго будзе праведзена вялікая масава-палітычная работа, калі да яго будуць рыхтавацца ўсе калгасы, усе калгасьнікі, калі па зьлёт калгасы Віцебшчыны прыдуць з рапартамі перамог. У нас у калгасах ня можа быць разгавораў аб тым, што па сканчэньні пасеўнай кампаніі настае пэрыяд міжпапар'я. Многа работы, якая ня церпіць вялікага адкладаньня, маецца ва ўсіх калгасах, ва ўсіх калгасных брыгадах, тым больш, што мы ня выканалі плян узьняцьця папару, тым больш, што ў нас надзвычай ганебна становішча праполкі, як каласавых, гэтак і гароднінны, тым больш, што рамонт інвэнтару да ўборкі ў радзе калгасаў пастаўлены «ў чаргу», тым больш, што большасьць калгасных брыгадзіраў яшчэ да гэтага часу ня маюць у сябе вразумелых, добра распрацаваных вытворчых заданьняў на праполку і ўборачную кампанію.

Першае, што патрабуецца ад кожнага калгасу, што павінен зрабіць кожны сельскі савет, што абавязана ўзначаліць кожная партыйная ячэйка гэта—прапрацаваць з калгасьнікамі, калгасам і ў калгасных брыгадах вынікі сяўбы, ход уздыму папару, арганізацыю праполкі і ўборачай кампаніі. Вось таму і гарадзкі камітэт партыі у сваёй пастанове ад 25 чэрвеня рэкамэндуе усім калгасам скарыстаць у гэтым вопыт калгасу „Малая Чэрніца", Замастоцкага сельсавету, ліст якіх быў зьмешчаны ва ўчорашнім нумары „Віцебскага пралетара". Праўленьне кожнага калгасу абавязана сабраць калгасьнікаў, расказаць як выкананы плян сяўбы, што і як робіцца па папары, па праполцы, як мяркуецца арганізаваць уборку ўраджаю, як мяркуе калгас арганізаваць хлебаздачу (пастаўку). Статут сельска-гаспадарчай арцелі яскрава гаворыць аб тым, што калгасьнік зьяўляецца гаспадаром свайго калгасу. І вось з ім як з гаспадаром, як з чалавекам, ад якога залежыць лёс калгасу і яго ўласны лёс трэба пагаварыць, параіцца, рашыць. Рашыць так, як гэта вучыць нас партыя, як гэтага ад нас патрабуюць інтарэсы нашай сацыялістычнай дзяржавы. Уся работа па падрыхтоўцы да ўборкі павінна быць прасякнута барацьбой за хутчэйшы высокаякасны разьлік з пралетарскай дзяржавай. Калгасьнікі калгасу „М.-Чэрніца, Замастоцкага сельсавету, актыў калгасу Рудніцкага сельсавету ня згодны і апракідваюць апартуністычную стаўку гарадзкога савету на расьцяжку хлебаздачы. Хутчэй правесьці хлебаздачу, гэтым самым фарсаваць справу засыпкі насенных фондаў і разьмеркаваньне ўраджаю—вось, што нам патрэбна, вось чаго павінны дабівацца ўсе калгасы, вось пад якім знакам павінны быць праведзены ўсюды шырокія вытворчыя нарады.

Усе калгасы Віцебшчыны маюць права і павінны ўдзельнічаць у раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў. Але-ж яскрава, што рад калгасаў, пры сёньняшнім сваім становішчы, ня могуць быць прадстаўлены на раённым зьлёце. Калгасы Рудакоўскага сельсавету, за выключэньнем калгасу «Дырыжабль», усе калгасы Рудніцкага сельсавету, Даўжанскага, злачынна запягнуўшыя сяўбу, змогуць паслаць сваіх дэлегатаў толькі тады, калі на папаравай, праполачнай і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, яны за гэтыя дзевяць дзён, пакажуць сваю здольнасьць як належыць калгасьнікам змагацца за тэмпы, за якасьць.

Мы з ўсёй сілай яшчэ раз падкрэсьліваем, што нават адстаючыя калгасы маюць час і права дабіцца дазволу на ўдзел у раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў. Трэба толькі ўзьняць сваю работу, трэба толькі пашчэнт разьбіць кулацкія антыдзяржаўныя тэндэнцыі і тады перамога будзе атрымана.

Мы заклікаем дэлегатаў першага раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў, які адбыўся 10 сакавіка, мы заклікаем дэлегатаў усебеларускага зьлёту і калгасных брыгадзіраў стаць у цэнтр падрыхтоўкі да другога раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў. Ня сёньня—заўтра мы чакаем баявога водгуку на наш заклік ад тт. Веташкова, з калгасу „Мопр", Сялюцкага сельсавету, Лысенка, з калгасу імя Чырвонай армії, Ялагінскага сельсавету, Буткевіча, «Шлях Леніна», Міхалёўскага сельсавету, Шылава, з калгасу «Замасточча» і ўсіх дэлегатаў усебеларускага і раённага зьлётаў калгасьнікаў-ударнікаў. Узначальце праверку у калгасах выкананьня саўдагавароў, праверце наколькі вы самі выканалі свае самаабавязацельствы, узятыя на Ўсебеларускім і раённым зьлётах калгасьнікаў-ударнікаў, баявымі дзеяньнямі сустракайце зьлёт перадавых. Мы вам робім заўвагу, што большасьць з вас, апраўдаўшыя назву лепшых калгасьнікаў раёну, не зрабіліся арганізатарамі падцягваньня адстаючых, не зрабіліся тымі перадавымі калгасьнікамі, якія дабіваюцца ударнай работы ня толькі у сваім, але і ў дзесятках суседніх калгасаў. Гэта трэба ўлічыць.

Вялікія абавязкі ўскладаюцца ў часе падрыхтоўкі і правядзеньня зьлёту на шэфскія арганізацыі, на рабочых і работніц гораду. Ганебнае адставаньне Віцебшчыны ў правядзеньні сяўбы—гэта прызнак ганебнага зьніжэньня, па сутнасьці кажучы, нашай шэфскай работы. Мы яшчэ не дабіліся адказнасьці усяго пралетарскага Віцебску за становішча вёскі. Толькі адзінкі наладзілі шэфскую работу і першым кандыдатам на ганаровы ўдзел на раённым зьлёце ўдарнікаў мы высоўваем калектыў лесакамбінату БВА. Людзі з камбінату, цяглавая сіла, трактар, спаборніцтва цэхаў з калгаснымі брыгадамі, штодзённыя клопаты аб сваім падшэфным калгасе—вось, што дало магчымасьць калгасу „Дырыжабль", Рудакоўскага сельсавету, перавыканаць плян сяўбы, вось, што дае права лесакамбінату быць вядучым да зьлёту і у часе самага зьлёту ў частцы паказацеляў сапраўднага пралетарскага шэфства. Рабочыя і служачыя Віцебскага аддзяленьня Белэнэрга гэтымі днямі на сваім агульным сходзе заслухаюць справаздачу свайго падшэфнага калгасу. Заслухаць гэты даклад трэба для таго, каб вылаяць саміх сабе, каб намеціць канкрэтныя задачы для неадкладнага ўмацненьня шэфства.

Арганізацыйная камісія абвясьціла спаборніцтва каапгасаў і аднаасобных вёсак на права ўдзелу ў якасьці гасьцей на раённым зьлёце перадавых калгасьнікаў. Віцебскім каапгасам газэта „Рабочий" учора зрабіла рашучае папярэджаньне за правал праполкі. І вось тыя каапгасы, якія навярстаюць упушчанае, якія пасьпяхова правядуць напаравую і праполачную кампаніі змогуць быць прадстаўлены на раённым зьлёце калгасьнікаў-ударнікаў. Гэта-ж поўнасьцю адносіцца да тых аднаасобных вёсак і асабліва тых, якія пасьпяхова правялі веснавую сяўбу.

За баявую бальшавіцкую падрыхтоўку да раённага і Ўсебеларускага зьлётаў перадавых калгасьнікаў. Перадавых калгасьнікаў пашлем на зьлёт з дакумантамі—рапартамі перамог на фронце пасьпяховага ажыцьцяўленьня сельскагаспадарчых работ першага году другой пяцігодкі.

ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ВОРЫВА ПАПАРУ на 25 чэрвеня.

СЕЛЬСАВЕТЫ.	Узарана ў га	Проц. вык.
Бараўлянскі	138,28	64,3
Бабініцкі	273	62,9
Віцебскі	61	65,5
В.-Лётчанскі	257	76,4
Даўжанскі	21,9	9,1
Міхалёўскі	193,36	55,7
Рудніцкі	33,78	7,4
Рудакоўскі	199,9	27,7
Сялюцкі	88,47	48,6
Старасельскі	166,74	91,1
Ялагінскі	116,97	55,4
Машканскі	245,17	28,6
Замастоцкі	221,67	53
Шумнянскі	29,23	6,4
Мікалаёўскі	39,85	9,5

Калгасы выканалі плян падёму папару на 40,1 проц., саўгасы—43,1, каапгасы — 59,7, аднаасобнікі—27,3. Усяго па раёне плян выкананы на 37,8 проц.

Папаравая плошча ня ўгнойваецца.

Калгас „Чырвоны ўсход", Міхалёўскага сельсавету—прыступаючы да ворыва папару, не скарыстаў усе магчымасьці, каб забясьпечыць папаравую плошчу гноем. Скарыстаны толькі гной ад абагуленай жывёлы, а гной, які маецца ў калгасьнікаў, ад неабагуленай жывёлы, праўленьне не скарыстала.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгорнуты слаба. Паміж брыгадамі не заключаны сацумовы, не мабілізаваны актыў на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду, не вядзецца вучоту ўдарнікаў, ня ўлічваецца іх праца і дасягненьні.

Праўленьню неабходна пераключыць сваю працу на ўдарныя тэмпы каб ня зьніжаць тэмпаў, узятых у час пасеўнай кампаніі, каб захаваць за сабою перадавое месца ў ворыве папару, ўборачнай кампаніі і пастаўцы хлеба дзяржаве.

Г. П. Шалыга.

„Устаноўкі" апартуністаў і перараджэнцаў з гарЗА.

ГарЗА парашыў нарэшце канкрэтна кіраваць калгаснай вытворчасьцю. Ён склаў пералік асноўных работ у калгасе, намеціў адны і тыя-ж тэрміны выкананьня гэтых работ ва ўсіх калгасах, мабілізаваў людзей, уручыў кожнаму з іх гэты пералік «асноўных работ», разаслаў людзей па калгасах складаць вытворчыя пляны, а сам заспакоіўся. Разъехаліся настаўнікі, аграномы па сельсаветах, у сельсаветы дадаткова яшчэ мабілізавалі людзей для складаньня вытворчых плянаў у калгасах для кожнай брыгады.

У калгасе імя 1 мая, Старасельскага сельсавету, тэрміны, вызначаныя гарЗА былі мэханічна прыняты і па ім складзены вытворчыя пляны для брыгад па ворыве папару, праполцы, уборцы ўраджаю і малацьбе, па пастаўцы дзяржаве сельгаспрадукцыі.

А ў калгасе «Малая Чэрніца», Замастоцкага сельсавету, доўга спрачаліся наконт гэтых тэрмінаў, асабліва па ўборцы ўраджаю, малацьбе і здачы с.-г. прадукцыі дзяржаве, і ня прынялі іх.

У чым справа? Чаму калгасьнікі калгасу «М. Чэрніца» ня прынялі тэрміны гарЗА. А справа ў тым, што гарЗА даў шкодную, антыдзяржаўную па сутнасьці справы, установку на расьцягваньне тэрмінаў уборкі, малацьбы хлеба і пастаўкі сельгаспрадукцыі дзяржаве. ГарЗА арыентуе калгасьнікаў на больш расьцягнутыя тэрміны.

Згодна дырэктывы партыі і ўраду ўборка азімых павінна быць праведзена за 8 — 10 дзён. Наша задача арыентаваць масы калгасьнікаў на больш сьціслыя тэрміны, у данным выпадку на сканчэньне ўборкі азімых за 8 дзён. Але гарЗА дае ўстаноўку наадварот — правесьці ўборку за 10 дзён. Уборку бульбы па дырэктыве ЦК і СНК трэба правесьці за 15—20 дзён, а гарЗА і тут дае ўстаноўку на 20 дзён. Па ўборцы аўсу і ільну гарЗА проста парушыў дырэктывы партыі і ўраду. Замест правядзеньня ўборкі аўсу за 15 — 18 дзён, а ільну за 12 — 15 дзён—гарЗА даў „свае" тэрміны—авёс і лён убраць кожны за 20 дзён.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове прапанавалі пачаць малацьбу збожжа не пазьней як праз 8—10 дзён пасьля пачатку ўборкі. ГарЗА і тут застаўся верным самаму сабе. Ён дае ўстаноўку на расьцягваньне малацьбы і раіць пачынаць малацьбу збожжавых толькі на дзесяты дзень пасьля пачатку ўборкі, малацьбу вікі — 20 дзень, гароху—15-ы дзень. Малацьбу большасьці культур па «ўстаноўцы» гарЗА трэба, па сутнасьці, пачынаць толькі пасьля сканчэньня ўборкі.

Першачарговая задача кожнага калгасу—сваячасовае выкананьне заданьняў па пастаўцы дзяржаве сельгаспрадукцыі. Згодна закону ўраду аб пастаўцы збожжа дзяржаве, 5 проц. пляну павінна быць выканана ў жніўні месяцы з першага абмалоту. «Трэба арыентаваць кожнага калгасьніка,—казаў тав. Гікало на нарадзе сэкратароў райкомаў і пам. палітадзелаў МТС па камсамольскай рабоце,—на тое, што збожжазагатоўкі павінны быць скончаны ў жніўні—верасьні, а па бульбе—у кастрычніку». Але што для гарЗА дырэктывы партыі і ўраду. Ён дае „ўстаноўку": у жніўні месяцы хлеба дзяржаве не здаваць, азімае пачаць здаваць толькі пасьля сканчэньня малацьбы, здачу астатніх культур пачаць толькі на пяты дзень пасьля малацьбы, расьцягнуць яе да месяцу і скончыць не раней як 10 кастрычніка.

Бульбу здаваць дзяржаве з першай копкі, вазіць на загатоўчы пункт непасрэдна з поля — такава дырэктыва партыі. А па «ўстаноўцы» гарЗА бульбу трэба здаваць не раней як праз 15 дзён пасьля пачатку копкі бульбы.

Камэнтары, як кажуць, не патрэбны. Дырэктывы партыі і ўраду груба парушаны. Зусім відавочна, што ўстаноўкі і дырэктывы гарЗА маюць на мэце сарваць тэрміны ўборкі і пастаўкі с. г. прадукцыі дзяржаве. Мы патрабуем ад гаркому партыі рашуча ўдарыць па руках апартуністаў і перараджэнцаў з гарЗА, якія імкнуцца працягнуць і насадзіць у нашых калгасах антыдзяржаўныя тэндэнцыі.

Т.

Усесаюзны рэйд праверкі гатоўнасьці да уборкі.

ЗАВОД „КАМІНТЭРН" ДРЭННА ЗМАГАЕЦЦА ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ЎБОРАЧНЫХ ЗАКАЗАЎ.

Камінтэрнаўцы і рабочыя такарнага цэху „Чырвонага мэталіста", вы абавязаны ў бліжэйшыя-ж дні скончыць выпуск частак і рамонт.

Нецярпімыя адносіны да важнейшага заданьня партыі.

Завод „Камінтэрн" яшчэ 23 красавіка атрымаў для рамонту 2 касаркі ад калгасу „Красный путиловец" (Астроўна). Прадстаўнік калгасу т. Шмідт павінен быў 29 красавіка аформіць заказ і ўнесьці аванс, але ж прайшло каля 2 месяцаў і толькі 5 чэрвеня ён зьявіўся і аформіў заказ. Заказ-жа заводам не выкананы да гэтага часу.

Такое-ж зьявішча і з боку Сеньненскай МТС якая яшчэ ў студзені месяцы здала заказ заводу на 5 тыс. руб. розных шасьцёрак да малатарань і жняярак праз прадстаўніка Капачова, які павінен быў 8 сакавіка аформіць заказ. Але да гэтага часу, нягледзячы на неаднаразовыя запытаньні з боку заводу, дагавор не атрыман і заказ анулываны.

Спэцыяльнага вучоту паступленьня заказаў па ўборачных частках да машын па заводзе не вядзецца. Загадчык сталом заказаў т. Міхайлоўскі тлумачыць гэта тым, што «нявартаў» траціць лішняй паперы для гэтага.

Сэкратар ячэйкі т. Геннін на запытаньне, якія маюцца заказы для ўборачных машын, адказаў, што ніякіх заказаў няма, акрамя сядзеньняў для касарак. У гэты-жа час на двары заводу валяюцца больш 2-х месяцаў не сядзеньні, а цэлыя касаркі, у якіх патрэбна зрабіць капітальны рамонт. Акрамя гэтага маецца яшчэ рад заказаў ад іншых калгасаў і саўгасаў.

Бюро ячэйкі пытаньнем выпуску і рамонту ўборачных машын не займалася. Рабочыя для гэтага не мабілізаваны і як вынік—да гэтага часу ячэйка ня ведае, што робіцца ў падшэфнай МТМ з рамонтам уборачных машын. Да гэтага часу на заводзе ўсё зьбіраюцца паслаць свайго прадстаўніка ў Лепельскую МТМ.

Такія адносіны да важнейшага заданьня партыі надалей нецярпімы. Зараз-жа патрэбна завесьці спэцыяльны вучот паступленьня заказаў па ўборачных машынах, разгарнуць работу па выкананьні заказаў.

Брук, Пімштэйн.

СВАЕЧАСОВА ДАЦЬ ЗАПЧАСТКІ ДА ЎБОРАЧНЫХ МАШЫН.

(Рэйд ударнік друку „Віцебскага пралетара" і шматтыражкі „Мэтпромавец").

Завод „Чырвоны мэталіст" яшчэ ў лютым месяцы атрымаў заданьне на выпуск запчастак да ўборачных машын і малатарань, у большасьці шасьцёрак да прывадоў, 4000 лыжак для касарак і 150 палявых калёс для жняярак.

Толькі ў маі месяцы гэта заданьне было спушчана цэхам, а апошнія за іх узяліся толькі ў апошні час.

На 25 чэрвеня па заводзе мы маем наступнае становішча: да коннага прыводу засталося зрабіць шасьцёрак малых, канічных 12 штук, цыліндрычных—88 штук, ролікаў нажымных—53 штукі, да прыводу СМП2 шасьцёрак канічных, у 16 зуб'еў—15 штук, да малатарні „Ланец" шасьцёркі двайныя—50 шт., шасьцёркі малыя барабанныя—481 шт., да малатарні БДО—34, укладышы барабаннага вала 500 шт. і г. д. Гэтыя дэталі прайшлі ўжо ўсе цэхі і застралі ў такарным цэху, які зьяўляецца зараз самым вузкім месцам на заводзе і які можа тармазіць выпуск гэтых частак.

Грамадзкія арганізацыі такарнага цэху зусім не мабілізаваны на хутчэйшае выкананьне гэтых частак. Ні сэкратар ячэйкі тав. Філіпоўскі, ні старшыня цэхкамітэту тав. Рутэнбэрг ні разу не паставілі гэта пытаньне на абгаварэньне рабочых, не заслухалі ні разу загадчыка цэху аб ходзе работы.

Партыйныя ячэйкі ліцейнага і зборачнага цэхаў абмежаваліся толькі тым, што паставілі пытаньне на бюро. Штодзённі цэхаў амаль ніякага ўдзелу ў выпуску запчастак ня прымаюць.

Па ліцейным цэху затрымліваецца выпуск 481 шт. шасьцёрак, малых барабанных, да малатарні „Ланец" і 30 шт. палявых калёс да жняяркі „першамайскай". Выпускаемыя часткі ліцейным цэхам, у значнай частцы, брак і нават тыя часткі, якія прапушчаны кантролем, не паддаюцца апрацоўцы ў такарным цэху. Трыкутнік ліцейнага цэху апусьціў за апошні час рукі, аб чым сьведчыць вялікі процант браку, які дасягае 17 проц., замест 6.

З боку рабочых ліцейнага цэху былі ўпесены некалькі прапаноў, якія далі вымяншэньне браку і паляпшэньне якасьці. Напрыклад, у тарцовай шасьцёўцы, на 13 зуб'еў замест салдацікаў, ставіць шпільці, а ў склад шышак замест солі ўжываць каніфоль.

Зборачнаму цэху засталася зрабіць 400 штук лыжак да касарак. Толькі тым была праведзена масавая работа па пытаньні аб значэньні выпуску запчастак. У брыгадах, працуючых на гэтых частках, было праведзена некалькі сходаў в растлумачэньнем задач, стаячых перад імі па хутчэйшаму сканчэньню запчастак. Лепшымі рабочымі-ударнікамі па выпуску запчастак паказалі сябе: Брук, Багарад, Шык, Алесьвяк, Голубеў, Прахарэнка на чале з загадчыкам цэху тав. Тэвелевым.

Партыйны калектыў, зэўком, якія да гэтага часу стаялі ў баку ад вырабу запчастак, павінны зараз жа ўзначаліць гэту работу, павесьці масава растлумачальную работу сярод рабочых, каб ня было ніводнай мінуты затрымкі з боку заводу ў выпуску гэтых частак. Ад кіраўніцтва заводу патрабуецца максымум ўменьня работаць, яно павінна дабіцца неадкладнага выкананьня заказаў.

Удзельнікі рэйду: Камінскі, Магергут, Мацыёл, Райхлін, Карунны, Хазанаў, А., Багарад, Воўкаў, Рэдліх, Шэўход, Касьцяноўскі, Файнбэрг, Шпогес, Перельштэйн, Сямёнаў, Папіш, Шутаў, Чэпікаў.

НЕАБХОДНЫ РАШУЧЫЯ МЕРЫ.

РУДАКІ 26. (Па тэлефоне).

Плян ворыва папару па сельсавеце злачынна зрываецца. Замест планавых 756 га, узарана на 26 чэрвеня 284,36. Зрываюць ворыва папару калгасы імя Чарвякова (старшыня калгасу Зайцаў), які ўзараў за 5 дзён усяго 8 га, «Шлях да сацыялізму» (старшыня калгасу Кузьміноў), які ўзараў 30 га, калгас „Прафінтэрн" (старшыня Мальчанка), які ўзараў 21 га і калгас імя Сталіна (старшыня Максімаў) які ўзараў 49 га. Такім чынам па ўсім калгасным сэктары мы маем ганебнае адставаньне ў ворыве папару.

Адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва папаравай кампаніяй і паслабленьне ў апошні час яе ходу прывяло да таго, што па калгасах страшэнна вырасьлі выпадкі лодырніцтва і прагулаў. Так, па калгасе імя Сталіна 25 чэрвеня ў адной брыгадзе прагуляла 7 чалавек. Прагульшчыкі пралезшыя ў калгас кулакі, падкулачнікі, якія імкнуцца сарваць папаравую кампанію.

Нормы выпрацоўкі ганебна нізкія. 24 чэрвеня другая брыгада таго-ж калгасу імя Сталіна на 9-ці конях узарала 2,15 га, што складае 0,24 га па каня, а ў чацьвёртай брыгадзе на 15 конях узаралі 2,85 га.

Такое становішча сьведчыць аб тым, што пасьля ганебнага зрыву веснавой пасеўнай кампаніі, кіраўнікі сельсавету і парт'ячэйкі ня ўлічылі ўсіх урокаў гэтай справы.

Таксама маецца прарыў і ў вывазцы гною. Па асобных калгасах (імя Чарвякова, «Шлях да сацыялізму») ня вывезена ніводнага возу гною на папар.

Неабходна неадкладна прыняць самыя рашучыя меры для узмацненьня тэмпаў папаравай кампаніі, для ачысткі калгасаў ад клясава-варожых элемэнтаў.

Раскін.

Прымацаваньне сельсаветаў да прадпрыемстваў.

У мэтах лепшага забясьпячэньня вытварэньня рамонту ўборачных машын для калгасаў, прымацаваць асобныя сельсаветы да наступных прадпрыемстваў.

«Чырвоны мэталіст»—Ялагінскі, Бабініцкі, Мікалаёўскі, Рудніцкі сельсаветы.

«Камінтэрн»—Шумнянскі, Сялюцкі, Рудакоўскі.

Аўтабаза—Старасельскі, Міхалёўскі.

Трамвайны парк—Бараўлянскі, Даўжанскі.

Чыгуначнае дэпо—Замастоцкі, Машканскі.

Арцель «Мэталь»—В.-Лётчанскі, Віцебскі.

Тэрмін сканчэньня рамонту касарак і конных грабель—трохдзённы, снопавязалак, жняярак, ільнацерабілак, сіласарэзак—да 1 ліпеня, бульбакапалак, малатарань збожжавых і ільняных—да 20 ліпеня.

ГарЗА.

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

Барацьба за выкананьне плянаў с.-г. работ— вось на чым правяраецца кожны вясковы камуніст

Яны „крыху“ вінаваты.

Слоў няма, у мінулым тав. Ахрамейка мае некаторыя заслугі перад рэвалюцыяй. Зазнаючыся камандзірам палка, начальнікам гарнізону ён не адзін раз атрымліваў перамогі над ворагамі, за што ў свой час партыя яго вела ні цэніла. Але ці можа гэта, хоць у малейшай ступені застрахаваць тав. Ахрамейка, калі зараз ён толькі пакасьціць партыі і пралетарыяту. Перарадзіўшыся і зросшыся з клясава-чужымі элементамі і разам з апошнімі ён імкнуўся сарваць сяўбу, а зараз хоча зрабіць тое самае з праполачнай кампаніяй у каапгасе «Білева».

Партыя даверыла тав. Ахрамейка адказную работу па кіраўніцтве каапгасам „Білева“. Гэта даверэ ён не апраўдаў. Аб гэтым гаворыць мноства фактаў.

Зьяўляючыся дырэктарам каапгасу, Ахрамейка з-за сваёй бязьдзейнасьці і расхлябанасьці зацягваў сяўбу на 32 дні, чым сарваў выкананьне пастановы партыі і ўраду аб тэрмінах сяўбы. І вось зараз, стоячы перад сталом камісіі па чыстцы, ён корчыць з сябе маленькага ягнёнка, які, бачыце, вядзіўся ціцца нават, як можна патрабаваць ад яго адказнасьці за зацяжку сяўбы, калі «надвор'е было дрэннае», «грязь неймаверная».

— Трактары нас падвялі. Пралічыліся.

— Значыцца прычыны зацяжкі сяўбы ў трактарах, ці што,—пытае тав. Карчэўскі.

— Бадай і мы крыху вінаваты,—прызнаецца Ахрамейка.

У далейшым Ахрамейка імкнецца скінуць з сябе віну за работу ў каапгасе, абвінавачваючы ва ўсім рабочых каапгасу.

— Я ўсе меры прыняў для выкананьня сяўбы. Работаў і дзень і ноч...

У далейшым камісія даведваецца, што ён мае ад ЦК КП(б)Б суровую вымову з папярэджваньнем за п'янку і дробна-буржуазную разпушчанасьць.

Работай каапгасу Ахрамейка кіруе дрэнна. Абязьлічка, няправільная расстаноўка рабочай сілы, бясплянавасьць у рабоце, стаўка на авось—усе гэтыя мінусы можна спаткаць літаральна на кожным кроку. І на дзіўна, што пры такім гаспадарці каапгасу камісія па чыстцы ўбачыла, як коні пасьвяцца на полі, засеяным вікай, а конюх сьпіць. Асабліва дрэнна стаіць справа з цяглавай сілай. Конюхі да коняй не прымацаваны і мяняюцца нібы рукавіцы. Трэба адзначыць, што Ахрамейка недапушчальна груба, бюракратычна адносіцца да рабочых і тэхнэрсаналу каапгаса.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы паведамілі камісіі па чыстцы, што зараз Ахрамейка «адпачывае» і бязьдзейнічае па праполцы і падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і што палі каапгасу зарастаюць пустазельлем.

* * *

Адказваючы на пытаньні членаў камісіі, т. Сяродкін—старшыня рабачкому каапгасу «Білева»—імкнуўся абыйсьці прычыны зацяжкі сяўбы.

— Чаму каапгас ня скончыў сваячасова сяўбу?

— Як? Мы скончылі.

— Скончылі, да позна. Хіба вы ня ведаеце пастановы ЦК і СНК аб тэрмінах скончэньня сяўбы?

— Ня ведаю, ня чытаў.

На пытаньне тав. Карчэўскага ці ўсё поле каапгасу пад пасевам, Сяродкін адказаў:

— Адкуль мне ведаць. Я не каморнік і не агранам.

— Вось, вы старшыня рабачкому. Ці мабілізаваў саюз рабочую масу супроць лодырэў, прагульшчыкаў?

— Бачыце, ня было магчымасьці...

Вытворчыя нарады ў каапгасе ня зьбіраліся. Сярод членаў прафсаюзу маюцца клясава-чужыя элементы, якія раскрадваюць каапгасную маёмасьць. За газіну перад пачаткам сходу па чыстцы в каапгасу была ўкрадзена карова Актыву ў гаспадарцы няма, у рабоце ўраўнілаўка. Усё гэта прыводзіць міма рабачкому.

Гэтыя агідныя сьці Сяродкін старанна замазваў перад камісіяй па чыстцы.

* * *

На жаль, на сходзе адступнічала бальшавіцкая самакрытыка «не зважаючы на асобы». У спрэчках выказвалася па некалькі чалавек. Прычына гэтаму—недастаткова праведзеная масава-растлумачальная работа сярод беспартыйнай масы аб мэтах і задачах чысткі партыі.

Бас.

Парт'ячэйка біяфабрыкі на чыстцы.

Яшчэ сьвежы ў нас у памяці абураючыя факты дзеяньняў клясава-чужых элементаў на біяфабрыцы № 5 у Доўжы. Тут у мінулым годзе зьвілі сабе прочнае гняздо кулакі, сыны і дочкі папоў, раскулачаных і нас ул „былых людзей“.

Яшчэ не застылі сьляды шкодніцтва мінулага году, як гэтымі днямі была зноў успышка, сапсавалася цэлая сэрыя сыраваткі (№ 9), што прынесла фабрыцы не адну тысячу руб. страт. Брак ў цэхах павялічваецца, бываюць выпадкі забруджваньня віруса, выпуск неўдабраякаснай сыраваткі працягваецца. Ці ня значыць гэта, што шкодніцтва працягваецца? Безумоўна, так!

Шкодніцтва не прыпынілася, а былыя кіраўнікі фабрыкі—камуністы Брушкоў (дырэктар) і Вераб'ёў—(нам. дырэктара) супакоіліся. Здзелі ў габінэтах і марылі аб тых салодкіх днях, калі біяфабрыка зможа работаць зусім без іх удзелу, калі іх, кіраўнікоў, ніхто не патрывожыць, ўсё будзе добра і будуць яны сьць прыпяваючы...

Вераб'ёў вельмі старанна ўзяўся ажыцьцяляць свае мары: ён выпісвае сабе і сябрам толькі пажадае каўбасы, вятчыны, малака, сарацей кажучы, ён, нарэшце, знайшоў для сябе цёплае месцэчка—дойную кароўку.

Камуністы Брушкоў і Вераб'ёў былі ўпэўнены, што фабрыка ўжо ачысьцілася ад клясавых ворагаў і можа спакойна пачываць на ўрах...

Праўда, час ад часу гэты спакой парушаў сэкрэтар партыйнай ячэйкі Гурэвіч і старшыня фабкому Мацьвеяў. Яны гарачыліся, выступалі з вялікімі прамовамі аб небясьпецы, не нічога не дамагаючыся, яны таксама замаўкалі, не найшлі рашуча супроць благадушша,—а пайшлі па лініі найменшага супраціўленьня.

Партыйная ячэйка заслухоўвала справаздачы аб ходзе выкананьня прамфінпляна, выносіла вялікія пастановы і гэтым... абмяжоўвалася. Толькі і было зроблена, што вынесена прамова Вераб'ёву, было пастаўлена на відмуністу Ткачэнка, за дачу рэкамэндацыі сыну кулака на работу, і партыйцу Мальтанаву, і укрываў клясава-чужыя элементы. На тым барацьба супроць перараджэнцаў спынялася.

Брушкоў і Вераб'ёў беспакарана пакінулі фабрыку, уехаўшы на працу ў іншае месца.

* * *

Самацёк, саноўна-барскія адносіны да работы—вось што панавала на фабрыцы.

Кіраўнікоў не турбавала, што крывая выкананьня прамфінпляну на фабрыцы з кожным днём капілася ўніз. Павольна і рытмічна ўвалі лічэбнікі ў бухгальтэрыі фабрыкі і выводзілі зводкі аб выкананьні вытворчага заданьня. А са зводак крычалі абураючыя лічбы: выраб сыраваткі—люты 89,9, сакавік—,5, красавік 33,8, май 16,47 проц.; выраб віруса вытворчага—за пяць месяцаў 54,34 проц. заданьня, выраб віруса (сымульт)—11 проц. заданьня.

Падлягала да выдаткаваньня сродкаў у адпаведнасьці з выкананьнем праграмы сыраватачным цэхам—151060 руб., фактычна выдаткавана 207441 р., перавыдатак 56381 р. Па будаўніцтве перавыдаткавана зарплаты на 18 тысяч руб.

Гэтыя лічбы гавораць аб апартуністычнай сыстэме кіраўніцтва фабрыкай. Яны добра характарызуюць работу партыйнай ячэйкі.

Саўгас Доўжа, які зьяўляецца сельгасцэхам біяфабрыкі, скончыў сяўбу толькі 19 чэрвеня. Яшчэ да сёньняшняга дню не складзен работы плян па праполцы і ўборцы ўраджаю.

Да указаньняў рабочых, кіраўнікі былі глухія. 15 каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў да сёньняшняга дню марынуюцца ў папках камуніста Шапкоўскага.

А пачнеце гаварыць аб прычынах прарываў—адразу атрымаеце адказ! «Вінаваты аб'ектыўныя прычыны».

Не, гора-кіраўнікі в партбілетамі ў кішэнях вінаваты у прарывах на біяфабрыцы.

* * *

Камісія ў складзе тт. Ліцкевіча (старшыня), Варшаўчыка і Казарэса канчае чыстку ячэйкі біяфабрыкі.

Праверкам атрымаў шмат заяў і матар'ялаў аб рабоце ячэйкі і паасобных членаў партыі ад рабочых і служачых фабрыкі. Рабочыя біяфабрыкі шчыра дапамагаюць партыйнай ячэйцы ачысьціцца ад перараджэнцаў, ад апартуністаў, ад элементаў.

Але трэба адзначыць, што бюро ячэйкі не правяла дастаткова актыўнасьці ў падрыхтоўцы арганізацыі сходаў па чыстцы. І таму кожны дзень сход пачынаўся са спазьненьнем на паўтары—язьве гадзіны. Калгасьнікі падшэфнага калгасу „Інтэрнацыянал“ ня былі прыцягнуты да ўдзелу ў чыстцы. Вельмі слабы ўдзел камсамольцаў. З 40 камсамольцаў, на сходах прысутнічала толькі 12—15 чал. З боку камуністаў, якія прайшлі чыстку, нагляданіся факты спазьненьня на наступныя, пасьля іх чыскі, сходы (Ткачэнка, Шнырова) і нават адсутнічаньне (Пашкевіч, Балабаеў). «Мы, сваю чыстку прайшлі»,—вось іх адказ.

Да складаньня характарыстык партыйная ячэйка адносілася казённа. Больш таго, у характарыстыках можна знайсьці такую бязглуздзіцу: „Удзел Малкіна у грамадзкай рабоце нездавальняючы, а партнагрузку выконвае“, «Брушкоў мае ў сабе моманты дробнасялянскага сацыялізму, ідэалёгічна устойлівы».

На шэсьцярых камуністаў зусім ня былі складзены характарыстыкі, з прычыны таго, што парт'ячэйка ня выявіла іх твар як камуністаў Гэта яшчэ раз даказвае, што парт'ячэйка ня бачыць жывых людзей, не займаецца выхаваньнем і вывучэньнем кожнага камуніста.

І. Казанскі.

ПАДРЫХТОЎКІ НЯМА.

Старасельская ячэйка КП(б)Б да чысткі партыі слаба рыхтуецца. За выключэньнем расзпоўкі пастановы ЦК і ЦКК аб чыстцы партыі і раздачы статуту і праграмы партыі каністам, нічога не праведзена.

Да гэтага часу яшчэ ня складзены характарыстыкі. Ніякай работы ячэйка не праводзіць сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, не мабілізуе іх у сувязі з чысткай на выраньне гаспадарча-палітычных задач. Іменна таму сельсавет ганебна адставаў у час правядзеньня сяўбы. Нягледзячы на тое, што камуністы Старага Сяла слаба палітычна падрыхтаваны, ніякай палітвыхаваўчай работы ў ячэйцы не праводзіцца.

Шэфы калгасаў імя «1 мая», «Новае жыцьцё» і „Камунар“—сыраварэвод і інструмэнтальна-мэблёвая фабрыка нічым не дапамагаюць камуністам гэтых калгасаў у падрыхтоўцы да чысткі партыі.

Грынман.

Кожны непраполаны га—удар па рабочым снабжэньні.

Каапгасы Віцебску праваліли тэрміны 1-й праполкі.

Напружыць усе сілы для таго, каб ачысьціць палі ад пустазельля.

КАТЭГАРЫЧНАЕ ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ ГАРПРАФСАВЕТАМ ВІЦЕБСКУ, МАГІЛЕВА І БАБРУЙСКА.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага савета прафсаюзаў Беларусі аб ходзе праполачнай кампаніі ў каапгасах.

Прэзыдыум ЦСПСБ канстатуе, што ход першай праполкі гародніх культур і баранаваньне бульбы знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. З 4.041 га бульбы прабаранавана на 20 чэрвеня 1303 га ці 32 проц. і гародніны—з 3.170 га—праполана 411, ці 12,9 проц., а ўсяго па БССР праполана ўсіх культур—23 7 проц. З 69 гаспадарак ня прыступілі да праполкі—35, ці больш паловы каапгасаў, плянуемых белкаапсаюзам. Па радзе каапгасаў ігнаруецца пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб агранамічных мерапрыемствах. Праполка ўтвараецца павярхоўна—трава зрываецца, а карэньні застаюцца ў глебе (дрэваапрацоўчы камбінат, швейнікі, ЦРК—Бабруйск) чым замяняецца эфэктыўнасьці і павялічваецца кошт апрапоўкі.

Віцебскія, Магілёўскія і Бабруйскія гаспадаркі ўвесь час плялася ў хвасьце і зрывалі тэрміны пасеўнай кампаніі і зараз яўна зрываюць праполачную кампанію (па віцебскіх гаспадарках праполата ўсіх культур—2,6 проц., Магілёве—8,5 проц., Бабруйску—10,6 проц.)

Прэзыдыум ЦСПСБ папярэджвае старшынь ГРПС—Віцебску—т. Крэмкевіча, Магілёву—т. Шапіра, Бабруйску т. Левіна, што калі на працягу бліжэйшых трох дзён ня будзе дасягнуты пералом у справе праполкі і апошняя ня будзе скончана ў тэрмін—яны будуць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці і зьняты з работы.

Абавязаць усіх дырэктароў каапгасаў і старшынь рабачкомаў бязадкладна дабіцца рашучага пералому ў правядзеньні праполачных работ, скончыўшы першую праполку ўсіх культур і баранаваньне бульбы не пазьней 30 чэрвеня.

Дырэктарам і агранамам каапгасаў строга кіравацца пастановай прэзыдыуму ЦСПСБ аб арганізацыі праполачных работ і агранамічных мерапрыемстваў. Прапанаваць начальніку сельска-гаспадарчага кіраўніцтва Белкаапсаюзу тав. Шлейфэру і старшыні ЦП саюзу рабочых земсаўгасаў тав. Байко і ўсім старшыням ГРПС мабілізаваць і паслаць адпаведную колькасьць агранамаў у каапгасы для дапамогі ў правядзеньні праполачных работ.

Абавязаць усе ГРПС, ЦП саюзаў і ФЗМК бязадкладна далажыць на сходах рабочых прадпрыемстваў і каапгасаў аб нездавальняючым ходзе праполкі і прыняць усе меры для актывізацыі рабочых, работніц і жонак рабочых у справе ліквідацыі адставаньня ў правядзеньні праполачных работ.

Абавязаць начальніка сельска гаспадарчага кіраўніцтва БКС тав. Шлейфэра ўстанавіць дакладны апэрацыйны ўлік ходу праполкі ў каапгасах (у тым ліку і ў гаспадарках ОРС-аў і ТСТ) і за несваечасовае прадстаўленьне зьвестак прыцягваць дырэктароў каапгасаў да судовай адказнасьці.

Прапанаваць ГРПС і ўпаўнаважаным ЦСПСБ праз кожную пяцідзённку пасылаць зьвесткі ЦСПСБ аб ходзе праполачнай кампаніі.

Для аказаньня дапамогі і стварэньня адпаведнага пералому ў праполцы накіраваць на 10 дзён у адстаючыя гарады: Віцебск—т. Кучаравага, Магілёў—т. Бойка, і Бабруйск—т. Шлейфэра.

Даручыць конкурснай камісіі і рэдакцыі газэты „Рабочай“ устанавіць па праполцы чырвоную і чорную дошкі.

На Сьпірыдонава, Мішурнага, Саладухіну, Нядзьвецкую трымаць раўнаньне.

Каапгас фабрыкі „Прафінтэрн“ в вялікім спазьненьнем закончыў сяўбу. Улічваючы ўроўні сяўбы, каапгас адразу ж пераключыўся на праполку гародніны. На сёньняшні дзень скончана першая праполка моркві, буракоў, турнэпсу, бобу. Праполата 2 га моркві, 0,45 га гуркоў, 0,39 га цыбулі, 1,5 га буракоў, 0,35 га турнэпсу, 0,32 га бобу. Апрача гэтага прабаранавана 37,85 га бульбы і зроблена акучваньне 15 га бульбы і рыхленьне 2 га моркві.

На палёх паказваюць узорныя прыклады работы ўдарнікі. Хаця рабочы калектыў каапгасу невялікі, але мы маем 15 лепшых ударнікаў. Вось адзін з іх Сьпірыдонаў Іван. Ён работае ў каапгасе в пачатку яго арганізацыі ўвесь час на палявых работах, да яго прымацаваная пара коняй выйшла лепшай па выглядзе ў брыгадзе, сельгасінвэнтар, што быў у яго, у справаздачы і на месцы, нормы выпрацоўкі ён заўсёды выконвае і перавыконвае, якасьць работы добрая. Сьпірыдонаў пасьля скончэньня сяўбы прэміраваны. Сьпірыдонаў не адзін. Мішурны Сяргей, Саладухіна Зінаіда, Нядзьвецкая Зіна і інш.—вось жывыя людзі—ударнікі каапгасных палёў, якія ажыцьцяўляюць плян, змагаюцца за ўзорны каапгас, за добры ўраджай.

Наш каапгас ачысьціўся ад клясава-варожых элементаў (Рудзёнак, Мануйкаў). Аднак, у каапгасе яшчэ засталіся вычышчаныя з калгасаў Ялагінскага сельсавету Касіцкая і Іванчэнка, якія сымулююць і шкодзяць рабоце каапгасу. Ад іх трэба хутчэй пазбавіцца.

Мы добрасумленна работаем па чыстцы палёў ад пустазельля, бо разумеем, што кожны непраполаны га—ўдар па рабочым снабжэньні і не дапусьцім, каб варожыя элементы нам перашкаджалі ў барацьбе за ўраджай, за дзесяткі тысяч тон гародніны. Дырэкцыя каапгасу павінна прыняць неадкладныя меры для ачышчэньня каапгасу ад кулацка-варожых элементаў.

Пару слоў мы жадаем сказаць аб кіраўніцтве з боку трыкутніка фабрыкі «Прафінтэрн» і ЗРК. ЗРК абмежаваўся толькі тым, што дапамог нарыхтаваць насеньне, а зараз нават і не заглядвае ў каапгас. Таксама і трыкутнік фабрыкі рэдка заглядвае ў каапгас.

Зараз перад намі паўстае баявая неадкладная задача—правесьці другую праполку, пачаць рыхленьне капусты, заканчваючы акучваньне бульбы, адначасова рыхтавацца да ўборачнай кампаніі. Да ўборачнай кампаніі мы набылі належны інвэнтар, як фурманкі, косы і бруські Мы ўжо прыступілі да касьбы па балоцістых мясцох і скасілі ўжо 4,5 га. Аднак, дырэкцыя каапгасу яшчэ не зьвярнула ўвагу на забесьпячэньне тарай для гародніны. Гэта неабходна ўлічыць.

Іменна ў час праполкі наш каапгас павінен узорна рыхтавацца да ўборкі в тым, каб сустрэць яе ва ўсеўзброеньні.

Рабкораўскі пост «Віцебскага пралетара»: Пятапенка, Рогаў, Мішурны.

ЧОРНЫ СЬПІС
КААПГАСАЎ, ЯКІЯ ПРАВАЛЬВАЮЦЬ ПРАПОЛКУ.

КААПГАС АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ.

Дырэктар Баярунас. Трыкутнік фабрыкі: Галуза, Цал, Галандцаў.

КААПГАС МОПР ФАБРЫКІ „ДЗЬВІНЫ“.

Дырэктар Шыльнікаў. Трыкутнік фабрыкі: Каплан, Вэксэлер, Собалева.

КААПГАС ЛЕСАПІЛЬНАГА І ФАНЭРНАГА ЗАВОДУ.

Дырэктар Баранаў. Трыкутнікі заводаў: Шапіра, Шафранаў, Клубнікаў, Мальчык, Алешка, Мількін.

КААПГАС «ЦЕРАСПОЛЬ».

Дырэктар Землякоў. Старшыня ТСТ Ком.

КААПГАС „БІЛЕВА“.

Дырэктар Ахрамейка. Старшыня праўленьня ЦРК Гіцовіч.

РАГОЖНЫ СЬЦЯГ ЗАСТАЕЦЦА Ў КААПГАСЕ „САКОЛЬНІКІ“.

Рагожны сьцяг, уручаны ў час сяўбы каапгасу „Сакольнікі“ пачэсным фабрыкі імя Цёткін, пакідаецца ў каапгасе за чарапашыя тэмпы ў праполцы. На 24 чэрвеня па каапгасе праполана 0,4 га цыбулі.

Што паведамляюць нам рабкораўскія пасты.

Злачыннае самазаспакаеньне.

Каапгас імя Молатава пры ЗРК мэталістаў, скончыўшы пасеўную в вялікім спазьненьнем, апынуўся зноў у пагражаючым прарыве з праполкай. Адміністрацыя гаспадаркі (Маркаў і Бялецкі) парашылі „адпачыць“, супакоіўшыся на тым, што сяўба скончана. А на самай справе, маецца 4,25 га моркві, з якіх праполана, на 24 чэрвеня, толькі 2,15. Астатнія зарасьлі пустазельлем. Сарнякі заглушылі таксама расьліны 10 га буракоў, 1,25 га цыбулі, 10 га гуркоў, да праполкі якіх яшчэ не прыступілі, разважаючы, што гэтыя расьліны яшчэ „пачакаюць“.

Рабочая сіла з заводу прыбывае непляванa, самацёкам. Замест патрэбных штодзённа 100 чалавек—прыбывае толькі 24—26, якія выконваюць норму, пры дрэнная якасьці, толькі на 20—25 процантаў. Трыкутнікам заводу маёмая работа не праводзіцца, у выніку чаго сярод некаторых рабочых маюцца шкодныя настроі: «Наша ласка—колькі зробім, столькі і добра». Рабочыя рамонтнага цэху Багданаў, Прог і Майсьлі ўвесь час 23 чэрвеня сымулявалі, выканаўшы норму толькі на 14 проц. і пайшлі даміў. Дэзэртыравала, з поля пасьля абеда брыгада ЗРК мэталістаў, прапалоўшы, пры дрэнная якасьці, за 9 гадзін в патрэбных 2970 кв. мэтр., толькі 120.

Рабачком самой гаспадаркі бязьдзейнічае. Сярод рабочых каапгасу не праводзіцца ніякай работы. У каапгасе маюцца лодыры і сымулянты, якія схаваліся пад крылышкам загадчыка гаспадаркі Зайцава. Так, напрыклад, за штодзённую сымуляцыю ў брыгадзе № 3 брыгадзірам Юдзіным былі зьняты з работы лодыры Гатоўскі і Пэўцер В., але Зайцаў паставіў гэтых дэзарганізатараў вытворчасьці на больш лёгкую працу. У дадатак ён аблаяў Юдзіна, гаворачы: «Калі ты будзеш мне разганяць рабочых, я з табою чыкацца ня буду».

Мы патрабуем ад трыкутніка заводу „Чырвоны мэталіст“ прыняцьця ўсіх захадаў да ліквідацыі прарыву в праполкай і падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі.

Рабкораўскі пост „В. П.“ Юдзін С., Юдзін В., Ягораў.

ЗА ГРАНІЦАЙ.

Заклік да арганізацыі супроцьсавецкага фронту.

На сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, адбываючайся ў Лёндане, сакораны рад падкамісій па розных пытаньнях 23 чэрвеня на закрытым паседжаньні падкамісіі па пытаньнях найбольшага спрыяньня (прадастаўленьня ільгот пры зьнешнім гандлі) прадстаўнікі Англіі, Японіі і Германіі сумесна выступілі ў замаскаванай форме супроць СССР.

Японскі прадстаўнік «асьвядаміўся» ці падлягае абгаварэньню ў гэтай камісіі пытаньне аб спосабах гандлю, ужываемых краінай, якую ён ня зьбіраецца называць, але дзе прамысловасьць належыць дзяржаве. Германскі дэлегат заявіў, што сумніцельна, каб з такой краінай можна было заключаць якія-небудзь згоды аб найбольшым спрыяньні, г. зн. на аснове ільгот пры зьнешнім гандлі. Старшыня падкамісіі (англец) у сваю чаргу ўказаў, што пытаньне аб гэтай краіне стаіць асобна. Капіталістычныя краіны павінны раней дагаварыцца паміж сабою.

«Правда» 26 чэрвеня піша па гэтым поваду: Германскі фашызм выкладвае свае супроцьсавецкія пляны ў Лёндане, дзе, па яго думцы, найбольш спрыяючыя ўмовы для іх ажыцьцяўленьня. Што гэта так—паказалі супроцьсавецкія выступленьні японскага, германскага і англійскага дэлегатаў на паседжаньні падкамісіі па найбольшым спрыяньні. Невядомая краіна, аб якой ідзе гутарка, гэта СССР.

Англа-японска-германскае аб'яднаньне невыпадкова, Яно паказвае накіроўваючую антысавецкую ролю англійскага імпэрыялізму. Усім вядомы супроцьсавецкія імкненьні германскага фашызму, вядомы таксама і намаганьні, якія прыкладае англійскі імпэрыялізм, каб нацкаваць на Савецкі саюз Японію. Тварцы „абудзіўшайся“ Германіі, бясьсільныя справіцца з ўнутраным становішчам, губляюць галаву Толькі ва ўспаленым мазгу страціўшых галаву людзей маглі нарадзіцца варварскія пляны ўстанаўленьня чужаземнага ўплыву ў Савецкім саюзе. Хай толькі паспрабуюць.

Забарона Германскай сацыял-дэмакратычнай партыі.

БЭРЛІН 23. Апублікован дэкрэт аб забароне Германскай сацыял дэмакратычнай партыі! Забарона матывуецца тым, што эмігравашыя за граніцу сацыял дэмакратычныя лідэры вядуць адтуль прапаганду супроць германскага ўраду. Такім чынам, усе спробы германскай сацыял дэмакратыі дабіцца ўдзелу ў палітычным жыцьці фашысцкай Германіі праваліліся.

Урадавы дэкрэт забараняе выданьне сацыял-дэмакратычных газэт, анулюе мандаты сацыял дэмакратычных дэпутатаў у рэйхстагу, ландтагах і гарадзкіх парлямантах. Забаронена ўсякія сацыял дэмакратычныя сходы, вядзеньня прапаганды і г. д. Апрача таго, дэкрэт прадпісвае зволіць усіх сацыял дэмакратычных рабочых і служачых з дзяржаўных і камунальных прадпрыемстваў і ўстаноў.

28 чэрвеня 1933 г., а 6 гадзіне ўвечары у памяшканьні клюбу гаркому КП(б)Б склікаецца

1-ШЫ ЗЬЛЁТ КАМСАМОЛЬСКІХ ГРУПОРГАЎ.

Абвестка дню:

1. Аб камсамольскай рабоце ў цэху і брыгадзе. Даклад сэкратара гаркому ЛКСМБ т. Старобінца.
2. Судаклады кіраўнікоў секцый.

Уваход па мандатах і камсамольскіх білетах.

Гарком ЛКСМБ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ.

—27 чэрвеня, а 6 гадзіне ўвечары, у Доме Камасьветы будзе прачытана лекцыя для выкладчыкаў палітэканоміі на тэму: „Мэтадалёгія палітычнай эканоміі“. Лектар т. Аксэльрод.

Культпроп ГК КП(б)Б.

— 27 чэрвеня, а 9 гадзіне ўвечары, у гаркоме ЛКСМБ (пакой № 6) адбудзецца нарада шэфработнікаў камітэтаў, калектываў і ячэек КСМ па пытаньні аб шэфрабоце камсамолу на вёсцы ў час уборачнай кампаніі і аб ходзе праполкі ў прыгарадных гаспадарках.

Гарком ЛКСМБ.

— 31 па 15 ліпеня 1933 году ўсе выкладчыкі—партыйцы і прапагандысты, працуючыя як у навучальных установах, так і на іншай рабоце (прадпрыемствы, установы), павінны зьявіцца ў Культпроп гаркому КП(б)Б для праходжаньня рэгістрацыі.

Культпроп гаркому КП(б)Б.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

Апошнія гастролі расійскай драмы Смаленскага гартэатру.

Сёньня, 27 чэрвеня Шылер

„КОВАРСТВО І ЛЮБОВЬ“.

Пачатак а 8 гадз. 30 мін. Білеты прадаюцца да 9 гадз. увечары.

У сувязі з паступаючымі запытаньнямі наконт ПАРАДКУ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ РАБОЧЫХ, СЛУЖАЧЫХ І СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ АД'ЯЖДЖАЮЦЬ У АДПАЧЫНАК у іншыя гарады, РАСТЛУМАЧВАЕЦЦА, што адпускнікі павінны ЗДАЦЬ СВАЕ НАБОРНЫЯ КАРТКІ ПА МЕСЦЫ ЖЫХАРСТВА і пры прадстаўленьні даведак аб зьняцьці з вучоту ПАВІННЫ БЫЦЬ УЗЯТЫ НА СНАБЖЕНЬНЕ ХЛЕБАМ У МЯСЦОВАСЬЦЯХ, КУДЫ ЯНЫ ПРЫЯЖДЖАЮЦЬ, па сьпісах, паказаных у даведках.

Інспэктар Гарснабу ПАГОСКІН.

578—4—1

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Віцебск № 12. Друкарня „Камінтэрн“, Бальшавіцкая, 10